# ЗАМАК НА ПЕРАДАВОЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Апошні бой, якіператварыў яго ў руіны, адбыўся акурат сто гадоў таму. Вось як апісвае ліпеньскія падзеі 1917 года рускі генерал Антон Дзянікін, які камандаваў Заходнім фронтам расійскай арміі: «Пасля няўдачы наступлення ўцечка салдат стала ўсё ўзрастаць і да цемнаты дасягнула вялізных памераў. Салдаты, стомленыя, знерваваныя, не звыклыя да баёў і грукату гармат, пасля столькіх месяцаў зацішша, бяздзейнасці, братання і мітынгаў, натоўпамі пакідалі акопы, кідаючы кулямёты, зброю, і сыходзілі ў тыл... Ніколі мне яшчэ не даводзілася бачыць пры такой перавазе ў колькасці штыкоў і матэрыяльных сродкаў. Ніколі яшчэ абстаноўка не абяцала такіх бліскучых перспектыў... І ўсё пайшло прахам...»



Варонкі ад артылерыйскіх абстрэлаў 100-гадовай даўніны дагэтуль «упрыгожваюць» унутраны двор Крэўскага замка.

Сённяшні выгляд Крэўскага замка — амаль такі, як і сто гадоў таму. Хроніка яго разбурэння адлюстравана на ўнікальных фотаздымках з калекцыі журналіста Уладзіміра Багданава, якія экспануюцца ў Нацыянальным гістарычным музеі ў Мінску. Дагэтуль, акрамя нямецкага афіцэра Фрыца Хофмана, яго баявых таварышаў і, вядома ж, уладальніка калекцыі, рэдкія кадры ніхто не бачыў.

— Гэтай маленькай выставай я хацеў бы прыцягнуць увагу да Крэўскага замка, які з'яўляецца адным з маіх любімых аб'ектаў па тэме Першай сусветнай вайны, — гаворыць Уладзімір Багданаў, які на працягу многіх гадоў даследуе гэты гістарычны перыяд. — Ён перажыў Вялікае Княства Літоўскае, выстаяў падчас польскай дзяржавы, Расійскай імперыі, Савецкага Саюза. Цяпер замак — частка мірнай Беларусі. Але менавіта сёння ён вядзе апошні бой: калі своечасова не прыняць меры, ад аднаго з найстаражытнейшых архітэктурных збудаванняў нашай краіны нічога не застанецца.

Нямецкія салдаты часоў Першай сусветнай вайны добра ведалі, дзе знаходзяцца іх войскі. Аб гэтым сведчыць хоць бы такі подпіс да аднаго з фотаздымкаў: «Наша пазіцыя ў замку Ягелонаў, пабудаванага ў XIV стагоддзі». Але іх праціўнікаў мала хваляваў лёс архітэктурнага збудавання. Грубыя сцены Крэўскага замка былі ўсяго толькі ключом у тактычнай абароне немцаў. Іх магла пакарыць толькі вялікая колькасць выстралаў самага буйнога калібру. «На жаль, — піша рускі і польскі генерал Іосіф Доўбар-Мусніцкі, — мне далі мала выстралаў, таму нанёс невялікую шкоду».

— У дзяцінстве Крэўскі замак для нас асабліва значэння не меў, бо мы каля яго нарадзіліся, жылі, — расказвае жыхар Крэва Іван Магер. — Мы ведалі, у якім стане ён знаходзіцца, але важнейшымі для нас, дзяцей, былі нямецкія акопы, бліндажы — там добра было гуляць у вайну. Першая сусветная не толькі знішчыла замак, яна нічога не пакінула ад Крэва: за тры гады вайны тут не засталося ніводнага будынка і падворка — адны варонкі.

Тэма Першай сусветнай апошнім часам усё часцей гучыць у сценах Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі. Па словах яго дырэктара Алега Рыжкова, яна перастае быць забытай, як было яшчэ некалькі гадоў таму. «Сёння мы ўпэўнена кажам пра тое, што беларусы ўплывалі на пэўныя сусветныя падзеі, непасрэдна ўдзельнічалі ў іх, што на беларускай зямлі былі падпісаны ўнікальныя палітычныя дакументы», — зазначае дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

**Фота Уладзіміра БАГДАНАВА і з яго калекцыі.**



Будынкі для асабовага складу каля ўсходняй сцяны ўнутры замкавага двара. Лета 1916 года.



Тое, што засталося ад усходняй сцяны Крэўскага замка. Вясна 2017 года.

**Колькі месяцаў таму «Звязда» ўздымала балючыя для мясцовых жыхароў і актуальныя для ўсёй беларускай культуры пытанні правядзення работ на тэрыторыі Крэўскага замка і магчымае аднаўленне ці кансервацыю руінаў. Так, паводле меркаванняў спецыялістаў, пра поўнае аднаўленне замка гаворкі пакуль ісці не можа: не захавалася дакументаў з дакладнымі апісаннямі замка, таму сёння нават складана ўявіць, які ён насамрэч выглядаў у старажытныя часы. Аднак адрэстаўрыраваць некаторыя элементы ўсё ж магчыма. Гаворка ідзе пра Княжаўскую вежу: да яе час паставіўся найбольш ашчадна. Мяркуецца, што менавіта з гэтага і пачнуцца работы ў замку. Паводле папярэдняй інфармацыі, Фонд Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва плануе выдзеліць на правядзенне адпаведных работ каля 100 тысяч рублёў. Гэтыя фінансы будуць скіраваныя не толькі на саму рэстаўрацыю і кансервацыю, але і на добраўпарадкаванне тэрыторыі вакол старажытных руінаў, падтрыманне належнага санітарнага стану. Нават разбураныя сцены сваім рамантычным вобразам могуць шмат распавесці зацікаўленаму.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Каля Аль-Аксы прынялі рамкі металадэтэктараў



Ізраільскія паліцэйскія знялі рамкі металадэтэктараў, якія раней усталявалі каля мячэці Аль-Акса. Гэта зроблена па рашэнні кабінета міністраў на чале з прэм'ерам Біньямінам Нетаньяху: улады вырашылі ўсталяваць на месцы спецыяльныя камеры відэаназірання. Кіраўніцтва мячэці, аднак, паўмерамі незадаволена і патрабуе дэмантажу ўсякіх сістэм забеспячэння бяспекі. Меры бяспекі сталі больш жорсткія пасля тэракта, у якім загінулі двое паліцэйскіх. Узмацненне мер бяспекі абярнулася канфліктамі ісламскай абшчыны з сіламі правапарадку, за апошнія два дні ў іх загінулі чатыры палесцінцы, сотні атрымалі раненні. У канцы мінулага тыдня кіраўнік Палесцінскай аўтаноміі Махмуд Абас заявіў аб разрыве ўсіх кантактаў з Ізраілем з-за новых мер бяспекі каля Храмавай гары.

### Па меркаванні МВФ, рост сусветнай эканомікі працягнецца

Міжнародны валютны фонд пацвердзіў прагнозы росту сусветнай эканомікі ў бягучым годзе на 3,5% і павелічэнне сусветнага ВУП налета яшчэ на 0,1%. Было адзначана зніжэнне ролі ЗША ў якасці крыніцы росту сусветнай эканомікі, але тэндэнцыя росту самой амерыканскай эканомікі захавацца. Сёлета яна вырасце на 2,5%. Палепшаны і прагноз па брытанскім ВУП. Эксперты МВФ чакаюць узмацнення росту сусветнага гандлю таварамі і паслугамі да 4% у 2017 годзе. У цэлым ліпеньская справаздача шмат у чым адлюстроўвае вынікі перагляду эканамічных прагнозаў па выніках місій супрацоўнікаў МВФ у шэраг краін. Палепшаны прагнозы росту эканомікі еўразоны ў цэлым і для Германіі і Францыі паасобку.

### Урад Польшчы правядзе судовую рэформу, нягледзячы на вета прэзідэнта

Рэформа будзе праведзена незалежна ад таго, ці рэалізуе кіраўнік дзяржавы свой намер, заявіў афіцыйны прадстаўнік урада рэспублікі Рафал Бахенек. «70% палякаў падтрымліваюць рэформы судовай сістэмы, прапанаваных PiS (кіруючай партыяй «Права і справядлівасць»). Цяжка зразумець рашэнне спадара прэзідэнта аб ветаванні законаў аб Нацыянальным судовым савеце і Вярхоўным судзе», — заявіў Бахенек у эфіры Польскага тэлебачання. Паводле яго слоў, абвясціўшы пра намер накласці вета на законы, прэзідэнт узяў на сябе адказнасць за гэтую рэформу. Прэм'ер-міністр Беата Шыдла ў найбліжэйшы час сустрэнецца з міністрам юстыцыі Збігневам Зебрам, каб абмеркаваць сітуацыю, якая склалася, дадаў Бахенек.

### Microsoft адмаўляецца ад графічнага рэдактара Paint

Карпарацыя Microsoft прызнала графічны рэдактар Paint састарэлым і заявіла аб намеры прыбраць яго з аперацыйнай сістэмы Windows. У апублікаваным кампаніяй спісе функцый, якія прызнаныя састарэлымі, гаворыцца, што яны не знаходзяцца ў стадыі актыўнай распрацоўкі і могуць быць выдаленыя ў будучых абнаўленнях. Чарговае маштабнае абнаўленне аперацыйнай сістэмы Windows 10 пад назвай Fall Creators Update выйдзе восенню гэтага года. Рэдактар Paint быў неад'емнай часткай Windows з моманту выхаду першай версіі AC у 1985 годзе. Праграма змяшчае базавыя прылады для рэдагавання графічных выяў і дазваляе ствараць малюнкі.

## «Звязда» збірае сяброў

**На спартыўным свяце, прымеркаваным да 100-годдзя газеты, выступяць вядомыя спартсмены Беларусі, сярод іх неаднаразовыя чэмпіёны свету па гіравым спорце браты Сігневічы. Яны пакажуць сілавое шоу з гірамі, правядуць майстар-клас, у якім змогуць прыняць удзел усе ахвотныя. Прадэманструюць простыя, але карысныя практыкаванні для кожнага аматара спорту, кульмінацыяй праграмы стане дэманстрацыя рарытэта — гіры 1874 года з царскай каронай.**



Малодшы з братоў — Ігар Сігневіч адзначае, што сёння здаровы лад жыцця — залог поспехаў ва ўсім. «У сучасных умовах тэмп жыцця вельмі хуткі. Каб яго не проста вытрымліваць, а ставіць перад сабой мэты і іх дасягаць, неабходна быць фізічна здаровым чалавекам. У суботу нам на асабістым прыкладзе хацелася б паказаць, што магчыма дасягаць вынікаў у спорце, сумяшчаючы трэніроўкі з прафесійнай дзейнасцю».

Падзяляе гэты пункт гледжання і старэйшы з братоў — Вадзім — заслужаны майстар спорту, чатырохразовы чэмпіён свету па гіравым спорце. Кампанію братам Сігневічам складуць Андрэй Гук — майстар спорту міжнароднага класа па паўэрліфтынгу, шматразовы чэмпіён Еўропы, Вячаслаў Харанека — беларускі асілак, аўтар сотні рэкордаў, Андрэй Зазерскі — шматразовы чэмпіён краіны па рукапашным боі, пераможца тэлепраекта «Бітва Тытанаў» і «Зачыстка».

**Сілавое шоу стартуе адразу пасля адкрыцця, якое адбудзецца 29 ліпеня ў 11.00 на стадыёне сталічнага ліцэя №1 на праспекце Газеты «Звязда». Акрамя сілавога шоу гледачы ўбачаць майстар-клас ад чэмпіёнаў краіны МФК «Сталіца» і лепшых прадстаўнікоў варкаўта Беларусі.**

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

## ЖЫЦЦЁ — КАШТОЎНАЕ

### Нават калі гэта жыццё маленькай птушкі



Сімвалічна, што ў Дзень пажарнай службы бабруйскія ратавальнікі падаравалі жыццё стрыжу, які трапіў у пастку. Аддзяленне аварыйна-ратавальнай часці №1 ехала на заняткі, калі іх тармазнуў нейкі мужчына на веласіпедзе. «Хлопцы, дапамажыце птушцы, — папрасіў ён, паказваючы на сцяну будынка, дзе з апошніх сіл трапятаўся стрыж. — Другі дзень мучыцца, небарака, самастойна вызваліцца не можа». Да мужчыны хутка далучыліся і іншыя спачуваючыя, якія былі сведкамі трапяткіх пакут. Ратавальнікі не аднойчы прыходзілі на дапамогу жывёлам, не пакінулі ў бядзе і птушку. Аперацыю па вызваленні правяла каманда ў складзе прапаршчыка Яўгена Лася, камандзіра аддзялення Уладзіміра Кітова і начальніка каравула Івана Макарэвіча. Іх дзеяннямі кіраваў падпалкоўнік Дзмітрый Сказаў. Як аказалася, стрыж зачапіўся за лёску і, калі б не чулыя людзі, загінуў бы.

Пад апладысменты людзей, якія назіралі за дзеяннямі ратавальнікаў, птушку выпусцілі. Дарэчы, для бабруйчан ратавальнікі свае людзі. У горадзе ніводнае свята не абыходзіцца без іх удзелу, а тым больш дзіцячыя аздараўленчыя лагеры. Сімвалічна, што ў гэты дзень у Бабруйску да пажарных часцей падыходзілі школьнікі з ахапкамі кветак, каб павіншаваць сваіх мужных сяброў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## МЕДАЛЬНЫ ЗВОН

**З перамогай вярнуліся беларускія школьнікі з 58-й Міжнароднай матэматычнай алімпіяды, якая прайшла ў Рыа-дэ-Жанэйра (Бразілія).**

Залаты медаль заваяваў выпускнік гімназіі №51 г. Гомеля Ягор Дубовік. У індывідуальным заліку ён заняў сёмае месца, набраўшы 29 балаў з 42 магчымых.

Сярэбраным медалём узнагароджаны выпускнік сталічнай гімназіі №41 Аляксей Васілеўскі, бронзавымі медалямі — выхаванцы Ліцэя БДУ Андрэй Нарадзецкі, Антон Палюховіч, Ілья Пчалінцаў і Аляксандр Юран.

Не засталіся без узнагарод нашы школьнікі і на 48-й Міжнароднай алімпіядзе па фізіцы, якую сёлета прымала Інданезія. Усе ўдзельнікі беларускай зборнай вярнуліся дамоў з медалямі. Мікіта Ігнацюк (выпускнік ліцэя №1 імя А. С. Пушкіна г. Брэста) і Яўген Шарамед (выпускнік гімназіі №10 г. Мінска) заваявалі сярэбраныя ўзнагароды. А Павел Курач (выпускнік брэсцкага ліцэя №1), Мікіта Стрыжак (выпускнік Ліцэя БДУ) і Валянцін Дарафееў (выпускнік Магілёўскага дзяржаўнага абласнога ліцэя №3) былі ўзнагароджаны бронзавымі медалямі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*